■ На прыродзе

# НЕ ЗАБРУДЗІМ — НЕ АДПАЧНЁМ?



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

**Штогод тэрыторыі для адпачынку каля вады даводзяцца да ладу — там усталёўваецца няхітрае, але неабходнае абсталяванне, напрыклад альтанкі, лаўкі, сметніцы. Аднак на наступны год усё паўтараецца: зноў за бюджэтныя сродкі ўсталёўваюцца альтанкі... Заканамернае пытанне: куды ж дзяваюцца леташнія? Жыццё паказвае, што знікненню цалкам могуць паспрыяць і рыбакі, якія падчас зімовай рыбалкі доўга не думалі пра тое, з дапамогай чаго сагрэцца... Словам, прыйшоў май — пачынай па новай. Каб з першай сапраўднай цеплынёй было дзе пакупацца ды прыродай палюбавацца.**

— Рэспубліканскі план мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі прадугледжвае навядзенне парадку ў тым ліку ў зонах адпачынку і на водных аб'ектах, — тлумачыць **кансультант упраўлення абыходжання з адходамі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі Віталь КАРАНЧУК.** — Нам неабходна ўстанавіць-адрамантаваць малыя архітэктурныя формы, інфармацыйныя знакі, уладкаваць ці адрамантаваць аўтамабільныя паркоўкі, кантэйнеры для збору смецця, абсталяваць тэрыторыі пітнымі фантанчыкамі, абсталяваць-адрамантаваць спартыўныя пляцоўкі, грамадскія прыбіральні. Больш за тысячу вызначаных па ўсёй краіне тэрыторый для адпачынку павінны быць уладкаваныя менавіта такім чынам. Раней правяраючыя дзяржаўныя органы досыць суб'ектыўна ацэньвалі работу мясцовых органаў улады па такім добраўпарадкаванні, таму сёлета былі ўведзены ўжо дакладныя крытэрыі, па якіх трэба рабіць візуальную ацэнку.

Што да чысціні такіх месцаў, то ў красавіку-маі да акцыі «Чыcты вадаём» Рэспубліканскае таварыства паляўнічых і рыбаловаў падключыла і тэрытарыяльныя органы Мінпрыроды і іншых міністэрстваў, а таксама грамадскія аб'яднанні, якія разам ачысцілі прыбярэжныя палосы ад смецця. Будзеце забруджваць ваду — будзеце адказваць паводле заканадаўства. Забыліся на шампуры і высеклі кустоўе? Таксама парушылі заканадаўства ў галіне аховы навакольнага асяроддзя (пашкоджанне дрэў і кустоў), а таму цалкам можаце заплаціць штраф, як і ў выпадку несанкцыянаванага размяшчэння адходаў.

Летась да адміністрацыйнай адказнасці было прыцягнута больш за 8 тысяч чалавек — галоўным чынам, за забруджванне смеццем лесу і паверхневых водаў. Дарэчы, праверка тэрыторый сельгаспрадпрыемстваў, ляснога фонду, прыдарожных палос, могілак, унутрыгаспадарчых кар'ераў і месцаў адпачынку на водных аб'ектах паказала, што больш за ўсё падобных парушэнняў выяўляецца на... тэрыторыях сельгаспрадпрыемстваў і месцах адпачынку на вадзе. Спробы рабіць меры адказнасці больш жорсткімі пакуль ніяк не дапамагаюць вырашыць праблему.

— Дзве трэці сучасный рэкрэацыйнай турыстычнай інфраструктуры Беларусі размяшчаюцца менавіта ў прыбярэжных палосах рэк і вадаёмаў, — адзначае **кансультант аддзела выкарыстання і аховы водаў упраўлення рэгулявання ўздзеяння на атмасфернае паветра і водныя рэсурсы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі Вікторыя ВОРАНАВА.** — Таму арганізацыя і абсталяванне месцаў масавага адпачынку на водных аб'ектах дазваляе, з аднаго боку, абмежаваць некантралюемае рэкрэацыйнае водакарыстанне, а з другога — забяспечыць неабходныя ўмовы. За мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі замацаваны абавязак па вызначэнні месцаў карыстання паверхневымі воднымі аб'ектамі для рэкрэацыі, спорту і турызму, а таксама па прынянцці мер па іх добраўпарадкаванні. Вызначацца такія месцы могуць паводле санітарна-гігіенічнай экспертызы. Сёння выканкамамі зацверджана 565 месцаў пляжаў для масавага адпачынку каля водных аб'ектаў. У Мінску налічваецца 20 пляжаў. Колькасць аўтастаянак для наведвальнікаў вырасла ў параўнанні з мінулым годам на 12 працэнтаў. У межах сталіцы арганізуюцца і дадатковыя стаянкі на гарачы час года. Устаноўлена дастатковая колькасць кантэйнераў для збору смецця, у тым ліку раздзельнага. Вываз будзе ажыццяўляцца штодня, а ў надта вялікую спёку нават двойчы на дзень.

У Мінскай вобласці размяшчаюцца 127 месцаў адпачынку. Пляжы падсыпаны свежым пяском, устаноўлена дадатковае пляжнае абсталяванне, ранейшае — пафарбавана, дадалося і шлагбаўмаў для папярэджвання несанкцыянаваных паркоўак. Санэпідслужба забяспечвае кантроль якасці вады. У выпадку выяўлення адмоўных проб інфармацыю даводзяць у тым ліку да насельніцтва. Свежую інфармацыю аб стане вады і наогул стане месца рэкрэацыі для масавага адпачынку можна атрымліваць у мясцовых цэнтрах гігіены і эпідэміялогіі. Пакуль можна сказаць, што надвор'е не спрыяла росту і цвіценню вадаёмаў.

**За незаконнае пашкоджанне расліннасці ляснога фонду — дрэў, кустоў, якія яшчэ працягваюць расці, можна атрымаць штраф у памеры да 30 базавых велічынь.**

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

# Кроў аб'ядноўвае ўсіх нас

## Пад такім дэвізам сёння праходзіць Сусветны дзень донара

**Кожнаму другому-трэцяму жыхару патрабуецца цягам жыцця гематрансфузія — пераліванне крыві. Нездарма гэту «чырвоную вадкасць» называюць нацыянальным рэсурсам. Лічыцца, што кожная краіна павінна самастойна забяспечваць такую патрэбу для свайго насельніцтва, і Беларусь гэта робіць.**

Летась у краіне было звыш 90 тысяч донараў — менавіта столькі людзей удзельнічалі ў данацыях. Дзякуючы ім удалося нарыхтаваць 218 т донарскай крыві, што стала самым вялікім паказчыкам за ўсе гады. Служба крыві сёння — гэта 19 станцый пералівання крыві, 6 абласных і 13 гарадскіх, 33 аддзяленні і крыху больш за 160 кабінетаў трансфузіялагічнай дапамогі.

— Штогод у нашай краіне праводзіцца не менш за 70 трансплантацый печані і не менш за 150 — стваловых гемапаэтычных клетак, а яшчэ трансплантацыі сэрца, нырак — усё гэта патрабуе трансфузіялагічнай падтрымкі, якая павінна аказвацца на самым высокім узроўні, — тлумачыць **вядучы навуковы супрацоўнік Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій Эсфір СВІРНОЎСКАЯ.** — Мы сёння навучыліся рацыянальна выкарыстоўваць кожную дозу донарскай крыві і кантраляваць яе бяспеку. Кожнае пераліванне любога кампанента крыві павінна быць бяспечным, па-першае, з пункту гледжання імуналагічнага (сумяшчальнага). Другі від бяспекі — інфекцыйная. Ніводная краіна свету пакуль не можа гарантаваць 100-працэнтную бяспеку пералівання крыві. Таму рэкамендуецца пераліваць кроў толькі па строгіх паказаннях.

— У бліжэйшыя два гады мы будзем укараняць яшчэ больш сучасныя метады абследавання донарскай крыві на маркёры інфекцый, — удакладняе **дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій Фёдар КАРПЕНКА.** — Будзе ствараца і адзіная інфармацыйная прастора службы крыві. Паралельна будзем працягваць працаваць над тым, каб донарства станавілася добраахвотным, рэгулярным і бязвыплатным.

Найвышэйшы ўзровень трансфузіялагічнай дапамогі, дасягнуты пакуль толькі 18-цю краінамі Еўропы, стаў магчымым там, дзе донарства — цалкам бязвыплатнае (донар не атрымлівае грашовае заахвочванне). Сусветная арганізацыя аховы здароўя заклікае ўсе краіны ісці менавіта па такім шляху развіцця трансфузіялагічнай медыцыны.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

■ Аты-баты

# ГАЛОЎНАЯ КЛЯТВА



**Больш чым 7 тысяч чалавек, прызваных на тэрміновую вайсковую службу, у мінулую суботу вымавілі словы прысягі. Клятву на вернасць Радзіме далі і тыя, хто праходзіць службу ў рэзерве.**

Па традыцыі павіншаваць маладых вайскоўцаў у злучэнні і воінскія часці прыбылі прадстаўнікі Міністэрства абароны, мясцовых органаў улады, грамадскіх арганізацый, духавенства, ветэраны, родныя і блізкія ваеннаслужачых.

Міністр абароны генерал-лейтэнант Андрэй Раўкоў паўдзельнічаў у цырымоніі прынянцця ваеннай прысягі ў 72-м гвардзейскім Аб'яднаным вучэбным цэнтры падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў, дзе ўрачыстыя словы вымавілі каля 1800 вайскоўцаў.

— Вы сталі паўнапраўнымі абаронцамі сваёй Айчыны, і беларускі народ давярае вам самае дарагое — забеспячэнне ваеннай бяспекі нашай суверэннай, незалежнай Беларусі, — звярнуўся да новага папаўнення **міністр абароны генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ.** — Я ўпэўнены, што пад кіраўніцтвам вопытных камандзіраў учарашнія школьнікі і студэнты паспяхова засвояць праграму баявой падрыхтоўкі і з гонарам выканаюць свой канстытуцыйны абавязак.

Акрамя таго, міністр адзначыў, што падзеі апошніх гадоў прадэманстравалі трываласць нашай дзяржавы, усёй сістэмы нацыянальнай бяспекі краіны. «На фоне войнаў і канфліктаў у свеце Беларусь паказвае здольнасць надзейна забяспечыць мір і стабільнасць у краіне, дэманструе найвышэйшую згуртаванасць беларускага грамадства», — падкрэсліў кіраўнік ваеннага ведамства.

Маштабная цырымонія прынянцця прысягі таксама адбылася і ў гісторыка-мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой».

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

■ Здарэнне

# ДЗЕЦІ ЗАБЛУКАЛІ І ПРАВЯЛІ НОЧ У ЛЕСЕ

**Гэта здарэнне, якое, на шчасце, нічым дрэнным не скончылася, адбылося ў Лепельскім раёне.**

Хлопчыкі пяці, дзевяці і дзесяці гадоў з розных сем'яў у вёсцы Заслонава ўвечары гулялі ў двары. Як расказаў **выконваючы абавязкі начальніка інспекцыі па справах непаўналетніх УУС Віцебскага аблвыканкама Аляксандр КАЗЮЧЫЦ,** усе мясцовыя, з добрых сем'яў. У нейкі момант дзеці зніклі з поля зроку дарослых. Напачатку вяскоўцы шукалі іх сваімі сіламі, а пасля звярнуліся ў міліцыю. Падключыліся і ратавальнікі, выкарыстоўваўся службова-пошукавы сабака. Каля 6.20 на крыкі ўчастковых, якія адпрацоўвалі прасёлкавую дарогу, з лесу выйшаў адзін з хлопчыкаў, які адвёў дарослых туды, дзе знаходзіліся астатнія. Па словах саміх дзяцей, яны пабеглі пагуляць у лес, дзе знаходзіцца вайсковы палігон. За забавамі і не заўважылі, як згубіліся. Блукалі па лесе да ранку, паспеўшы нават паспаць пад кустом. Як заznačыў Аляксандр Казючыц, хлопчыкі не пацярпелі, у шпіталізацыі патрэбы не мелі. Нават напалоханы былі не вельмі моцна. Яны так доўга блукалі, што гэта збіла са следу сабаку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Гэта мы, Госпадзі?!.

# ЖОНКА ДЗЕЛЯ КВАТЭРЫ СПРАБАВАЛА ЗАБІЦЬ СУЖЭНЦА

## Выратавала мужчыну толькі тое, што пра замах ведалі

**У Віцебску непрацуючая 35-гадовая грамадзянка спрабавала пазбавіцца ад свайго 40-гадовага мужа, які толькі вызваліўся з калоніі. Паводле інфармацыі прэс-службы УУС Віцебскага аблвыканкама, яны пазнаёміліся, калі мужчына адбываў пакаранне за здзейсненыя злачынствы. Гісторыя скончылася роспісам, і жонка атрымала ў распараджэнне трохпакаёвую кватэру, якую здавала ў арэнду, а сама жыла на здымнай.**

Калі сужэнец вызваліўся, яна адвезла яго на іншае здымнае жытло ў абласным цэнтры і арганізавала там святочную вячэру. Жанчына падліла ў шклянку з загадзя падрыхтаванага шпрыца моцнадзейнае рэчыва, якое павінна было «адключыць» сужэнца. Пасля гэтага яна планавала ўвесці астатняе рэчыва з іншых шпрыцаў. Дзякуючы таму, што міліцыянеры загадзя ведалі пра намер жонкі, атрымаўшы аператыўную інфармацыю, яе сужэнец застаўся жывы: аператыўнікі ўварваліся ў кватэру і затрымалі падазраваную. У яе быў канфіскаваны шпрыц з рэшткамі рэчыва і яшчэ некалькі, таксама запоўненыя лекавым сродкам.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ТРАЙНОЕ ЗАБОЙСТВА НА ГЛЕБЕ РЭЎНАСЦІ

**У Смаргонскім раёне забітыя двое мужчын і жанчына, яшчэ адна ахвяра шпіталізавана.**

Паводле слоў афіцыйнага **прадстаўніка ўпраўлення Следчага камітэта па Гродзенскай вобласці Сяргея ШАРШАНЕВІЧА,** 12 чэрвеня прыблізна каля дзвюх гадзін ночы ў дзяжурную часць міліцыі патэлефанавала 38-гадовая жыхарка вёскі Солы. Яна паведаміла, што яе 33-гадовы муж нажом здзейсніў у доме суседзяў забойства трох чалавек і прычыніў цялесныя пашкоджанні ёй самой.

Падчас агляду месца здарэння следчыя раённага аддзела Следчага камітэта і абласнога апарата, а таксама эксперты і супрацоўнікі міліцыі выявілі ў жылым доме без прыкмет жыцця з бачнымі цялеснымі пашкоджаннямі трох раней судзімых мясцовых жыхароў — мужчыну 1981 года нараджэння, яго бацьку, 1954 года нараджэння, і сужыцельку апошняга, 1969 года нараджэння. Жанчына, што паведаміла аб здарэнні, шпіталізаваная з рэзанымі ранамі рукі і нагі. Пагрозы яе жыццю няма. Падазраваны, які знаходзіўся ва ўласным доме ў стане алкагольнага ап'янення, затрыманы. Падчас допытаў вылучана версія здзяйснення ім забойства 35-гадовага мужчыны на глебе рэўнасці. Двое іншых грамадзян былі пазбаўленыя жыцця пасля таго, як сталі сведкамі таго, што адбылося.

Следчымі вывучаецца асоба падазраванага. Раней да крымінальнай адказнасці ён не прыцягваўся, месца працы не мае. Вырашаецца пытанне прымянення ў дачыненні да яго меры стрымання ў выглядзе змяшчэння пад варту. З улікам характару і цяжкасці злачынства ў дачыненні да фігуранта будзе праведзена судова-псіхіятрычная экспертыза для ўстанаўлення здольнасці ўсведамляць фактычны характар і грамадскую небяспеку сваіх дзеянняў, несці адказнасць за зробленае.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*